Год I. Серада 14 сьнежня (1 дзекабра) 1921 г. № 14

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno; Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месяцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак

Пастанова Беларускага Нацыянальнага Камітэту.

ПРЫМАЮЧЫ ПАД УВАГУ:

1) што Заходня-Беларускія землі, якія адыйшлі ад Расеі, штучна падзелены на часткі паміж „Сярэдняй Літвой“ і Польскай Рэчпаспалітай,

2) што ў спорцы паміж Польскай і Літоўскай Рэспублікамі аб тэрыторыю „Сярэдняй Літвы“ у межах каторае беларусы становяць бязумоўную большасьць, голас Беларускага Народу і яго інтарэсы зусім ня прымаюцца пад увагу,

3) што зьбіраны цяпер Сойм „Сярэдняй Літвы“, мае пастанаўляць аб долі толькі аднае часткі Заходняе Беларусі — пад той час, як другая зусім пазбаўлена права самастанаўленьня,

4) што ня гледзячы на разнароднасьць насяленьня „Сярэдняе Літвы“ і спорнасьць яе тэрыторыі, уся ўлада знаходзіцца выключна у руках аднэй нацыянальнасьці—польскай, у значнай меры, навет ня ў руках грамадзян краю,

5) што функцыі і характар Сойму афіцыяльна не устаноўлены, а факт склікаяньня яго пры аднастароннай уладзе не дае пэўнасьці, што праектаваны Сойм будзе запраўдным выяўленьнем волі краю,

6) што ў працягу блізка трох гадоў усім і способамі, даступнымі дзяржаўнай уладзе, праводзілася на зямлі Беларускай палітыка нацыянальнага уціску беларусаў, зачыняліся беларускія школы, газэты, эканамічныя арганізацыі і нішчылася ўсялякая праца над культурным і эканамічным разьвіцьцём Беларускага Народу,

7) што, пасьля такой трохгадовай палітыкі цяпер, пры кароткім 30-дзённым выборчым пэрыядзе, дэзарганізаванае і дэзарыентаванае беларускае насяленьне ня здолее сьвядома і свабодна выявіць свае думкі і жаданьні — тым больш, што навет і на час выбараў не абвешчаны адпаведныя гарантыі свабоды; што і далей уладаюць вядзецца палітыка закрываньня беларускіх школ зачыненьня і забароны незалежнае беларускае прэсы і т. д.

8) што пры такіх варунках вольнае і сьвядомае выяўленьне волі насяленьня нашага краю дарогай выбараў у праектаваны Сойм немагчыма,—

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМІТЭТ гэтым заяўляе, што запраўднае выпаўненьне волі народу ў Віленскім Сойме, які здаўна выпісаны, як палітычны кліч, на штандарах усяе краёвае дэмакратыі, магчыма толькі пры ўчасьці ў упраўленьні краем усіх яго нацыянальнасьцей на парытэтных асновах, пры фактычным забасьпечаньні грамадзкае і нацыянальнае свабоды у працягу даўжэйшага часу і пры пашырэньні выбараў у Віленскі Сойм на ўсе Беларускія землі, якія адыйшлі ад Расеі. Толькі пры такіх умовах, магчыма так патрэбнае аб'яднаньне ўсіх нацыянальнасьцей краю на грунце творчае дзяржаўнае працы і правільнага выяўленьня волі ўсяго насяленьня.

Вільня, 10. XII. 1921

Часовая Урадавая Камісія Віленскага Саюзу Каапэратываў.

Склікае на 28 сьнежня (дзекабра) г. г. аб 11 гадзіне раніцы надзвычайнае вальнае сабраньне паўнамоцнікаў у будынку Польскага Работніцкага Дому (вул. Жэлігоўскага 4) з гэткім парадкам дня: 1) выбары прэзыдыуму зьезда, 2) выбары Мандатнай і інш. Камісій; 3) справаздача Рэвізыйнай Камісіі; 4) справаздача Рады; 5) справаздача бышага ўраду; 6) справаздача Часовай Урадавай Камісіі аб цяперашнім палажэньні Саюза; 7) плян будучай дзеяльнасьці і арганізацыя Саюзу; 8) выбары Ураду і іншых органаў Саюзу; 9) вольныя пытаньні.

Калі-б 28 сьнежня не зьявіўся адпаведны па Статуту Саюза лік паўнамоцнікаў, чарговае вальнае сабраньне склікаецца там-жа, 29 сьнежня аб 11 гадзіне раніцы і яно будзе лічыцца правамоцным пры абы-якой колькасьці прыбыўшых на сабраньне паўнамоцнікаў.

Часовая Урадавая Камісія Вілен. Саюз. Каапэрат.

Становішча ліцьвіноу у справе выбарау у Віленскі Сойм.

7 сьнежня Часовы Літоўскі Камітэт у Вільні, як піша „Vilnetis“ ад 8 сьнежня, паслаў п. Л. Грабоўскаму, старшыні Выбарчай Камісіі віленскага мястовага вокругу гэткае паведамленьне:

„У вадказ на Вашае паведамленьне ад 3-XII-1921 г. № 13, у каторым Вы просіце аб прысланьні Вам Часовым Літоўскім Камітэтам у Вільні сьпіску асоб да ўчасьця ў выбарчых камісіях, Камітэт падае да Вашага ведама, што просьбы Вашай споўніць ня можа з чародных павадоў:

1) Часовы Літоўскі Камітэт у Вільні ёсьць выбраны арганізаваным літоўскім грамадзянствам у Вільні з мэтаю выяўленьня і абароны патрэб гэтага грамадзянства, становішча якога і ў паасобных справах стараючыся зрэалізаваць, Камітэт ня можа прыймаць вучасьця ў працы, шкодзячай інтарэсам літоўскага грамадзянства.

2) Трохгадовае да гэтага часу кіраваньне палякоў у Віленшчыне паказывае, што польская ўлада і арганізаваная часьціна польскага грамадзянства, мясцовага і немясцовага, навет прымушаныя лепей абхадзіцца з жыхарамі, каб той край прылучаўся да Польшчы, няраз уціскаюць і перасьледуюць ліцьвіноў, іх грамадзкае і асабістае жыцьцё, ксяндзоў, школы, газэты, гандлёвыя і прамысловыя ўстановы, таварыствы, дужэй за ранейшых уціскаьнікаў, нехаваючы свайго хаценьня выкараніць літоўскасьць у Віленшчыне.

3) Польскае грамадзянства арганізуе сойм у Вільні з тою мэтаю, каб карыстаючы акупацыйнымі сродкамі і манапольнасьцю палітычнай працы, прымусіць Віленшчыну злучыцца з Польшчаю, каб яе потым абпалячываць.

4) З гэтаю мэтаю Віленшчына даўно ўжо абрабляецца прысланымі з Польшчы і за грошы згульнага агітатарамі, прычым надта пільна сачаць, каб ніякі дзеяч з незалежнай Літвы ня прыбыў з за лініі дэмаркацыйнай у Віленшчыну для работы на карысьць Літвы, а тутэйшыя літоўскія дзеячы перасьледуюцца і агранічываюцца.

5) Польская адміністрацыя ў Віленшчыне зьнішчыла літоўскія сілы і установы, забрала ў свае рукі ўсю агітацыю, да вышэй-паказанай мэты кіруе сыстэму і спосаб правядзеньня выбараў, да апошняга мамэнта ня спыняючы перасьледаваньня ліцьвіноў.

6) У такіх варунках навет абяцаныя на час выбараў „вольнасьці“ будуць нічым, сойм адаб'е думку толькі збаламучанай агітатарамі з Польшчы меншасьці грамадзянства, адцягне час узвароту Віленшчыны да незалежнай Літвы і тым самым яшчэ дужэй утрудніць сытуацыю Літвы, а злашча становішча віленскіх ліцьвіноў.

7) Дзеля ўсяго паказанага, віленскае літоўскае грамадзянства, не жадаючы выступіць супроць свайго народа і радзімы, ня ўчаствуе ў выбарах у такі сойм, і споўняючы яго волю Часовы Літоўскі Камітэт таксама адмаўляецца ад вучасьця ў такіх выбарах.

Старшыня Камітэту Міхал Біржышка

Сябры Камітэту: К. Чыбірас.
Б. Біржышкене
Кан. І. Кукта.
С. Яцкевічыус.
К. Сташыс.

Сэкрэтар Камітэту: Др. І. Аўгевічыус.

Хто пойдзе на выбары?

Газэта „Nowiny Wileńskie“ паведамляе з дня 12 сьнежня:

За апошні тыдзень у справе выбараў у Віленскі Сойм аканчальна выясьнілася, што ліцьвіны, беларусы і яўрэі пастанавілі ня прымаць вучасьця ў выбарах. Палякі пойдуць на выбары ня ўсе. Магчыма, што будуць вучаствуваць у выбарах бальшавікі.

Розныя весткі.

Паўстаньне на Беларусі (?).

Украінская львоўская газэта „Рідний Край“ (№ 267) паведамляе з дня 2 сьнежня, што „на Беларусі выбухнула супроць-савецкае паўстаньне, якое абхапіла ўвесь прастор савецкай Беларусі. Дайшло да страшнай крывавай расправы над чырвонаармейцамі. Ім выпалівалі на лабох зьвёзды, а тады дабівалі штыхамі. Сяляне Гомельскай губэрні арганізуюць свае аддзелы“...

Скуль узяла гэтыя весткі газэта, у ёй, на жаль, не паказана. Трэба думаць, што яны „трохі перабольшаны“.

Арэшт беларускага дэлегата.

Польская ўлада арыштавала езьдзіўшага ў Прагу на Беларускую Нацыянальна-Палітычную Нараду вучыцеля Жабінскага.

(„Украін. Слово“).

Што чуваць у сьвеце?

Разгром гішпанцаў у Марока

Парыжская часопісь „Журналь“ паведамляе, што гішпанцы ў Марока каля Ріф разгромлены. Тысячы гішпанскіх жаўнераў забіты, тысячы ўзяты ў няволю. Афіцэры генаральнага штабу самі застраліліся. Галоўнакамандуючы гішпанцаў прапаў бяз весьці. Правадыр мараканскіх паўстанцаў Абдул-Кэрым паведаміў гішпанскі ўрад, што дасьць загад пазабіваць усіх палонных гішпанцаў, калі гішпанскае войска перайдзе раку Карф.

Ірляндыя.

Сярод сінфэйнэраў вышла нязгода ў справе адносін да скончаных перагавораў з Англіяй. Дэ-Валера настроен варожа да ўмовы з ангельцамі на падставе лёнданскіх перагавораў.

Ягіпет супроць Англіі.

Ангельскія газэты паведамляюць, што ў Ягіпце пачаўся байкот ангельскіх тавараў. Ягіпецкія нацыяналісты рыхтуюцца да рашучага змаганьня з ангельскім панаваньнем. У Каіры знойдзен тайны склад бонбаў.

Італія і Францыя.

За астатні час выясьнілась значнае непаразуменьне між Францыяй і Італіяй. Францускі ўрад стараецца, каб як зьменшыць гэтае непаразуменьне. У Італіі адбыліся супроць-францускія маніфэстацыі.

Справа Усходняй Галіцыі.

„Вінэр Тагэблят“ паведамляе з Парыжа, што зараз па заканчэньні Вашынгтонскай канфэрэнцыі Найвышэйшая Рада займецца разглядам справы Усходняй Галіцыі.

Усерасейскі зьезд Саветаў.

20 сьнежня ў Маскве зьбярэцца Усерасейскі зьезд радаў, які займецца справамі, глаўным чынам, эканамічнай палітыкі.

Судзяць польскіх камуністаў.

У Лодзі судзяць колькідзесят камуністаў, абвінавачаных у камуністычнай прапагандзе ў Польшчы.

Ленін вяшчуе новую вайну.

Ленін меў гутарку з адным амэрыканскім дзеячам, у якой выказаў пэўнасьць, што неўзабаве пачнецца японска-амэрыканская вайна.

Новы трактат.

ВАШЫНГОН, 12 сьнежня (АВ). У суботу Вашынгтонская канфэрэнцыя апублікавала фармальную пастанову аб заключэньні трактата Амэрыкі з Англіяй, Японіяй і Францыяй.

Забіўца 11 палюбоўніц засуджаны на сьмерць.

У Парыжы скончылася вядомая на ўвесь сьвет судовая справа нейкага Лянрі абвінавачанага ў забіваньні сваіх палюбоўніц. Прысяжныя прызналі яго зінаватым па 46 пытаньнях з 48 заданых ім. Пасьля кароткай нарады судовы трыбунал засудзіў Лянрі на кару сьмерці. Засуджаны кажа, што ён невінават, бо нікога не забіваў.

Беларусы у Латвіі.

ЛЮЦЫН. 25. XI. 21 (ад уласнага карэспандэнта).

Праца Т-ва „Бацькаўшчына“ вельмі цешыць тутэйшае беларускае грамадзянства.

У мінулую нядзелю адбылася ў Люцыну новая беларуская вечарынка, зробленая Гуртком Моладзі пры „Бацькаўшчыне“ і прашоўшая з добрым усьпехам.

Стаўлена была п'еса „Міхалка“.

За мінулыя два тыдні адчыніліся ў розных валасьцёх Люцынскага павету некальні аддзелаў т-ва „Бацькаўшчына“.

На гэтым тыдню чакаем у Люцыне прыезду з Рыгі Кіраўніка Беларускага Дэпартаманту пры Міністэрстве Прасьветы, гр. Сакарава, які прыедзе да нас па справах беларускае школы.

Палякі—памешчыкі і шляхта страшэнна незадаволены пашырэньнем беларускай сьвядомасьці, бо заўсёды лічылі беларусаў-каталікоў за палякоў, зьневажалі беларускую мову і цягнулі беларусаў-каталікоў у польскую школу.

Зборнік „Беларускіх Ведамасьцей“ № 3.

Зьмест: Фантазія; Унія Літоўска-Беларускага гасударства з Польшчай 1386-га году — У. Ігнатоўскага; З Літэратурнае Хрыстаматыі (Вінцук Дунін-Марцінкевіч—з патрэтам паэта); Вайна, голад, пэрапала... — верш В. Д.-Марцінкевіча; Голас сіраты з прытулка — верш Прытулковай В.; Абвесткі.

Цана: 22 польскіх маркі з перасылкай, для падпісчыкаў „Белар. Ведам.“ — 15 марак з перасылкай.

Паведамленьне.

Прафэсыянальны саюз рабочых безьзямельных і малазямельных Сярэдняй Літвы склікае на 26 сьнежня зьезд у Вільні прадстаўнікоў безьзямяльных і малазямельных сялян Сярэдняй Літвы.

Кожная вёска і маёнтак мае права паслаць па два прадстаўнікі, а калоніі Ізраільскіх рабочых і фальваркі па аднаму. Прадстаўнікі павінны мець з сабою адпісы пратаколаў і ежы на два дні. Зьяўляцца павінны загадзя у канцэлярыю Саюза (Вільня, Віленская вул. № 12). На зьездзе будуць разглядацца гэткія пытаньні: 1) Справаздача кіраўніцтва саюза. 2) Выбары цэнтральнага бюро. 3) Бягучыя справы.

Кіраўніцтва Саюза.

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бароніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце на вёску хоць адзін экзэмпляр. Калі будзе больш падпісчыкаў, газэта станець на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце падпісываццa, бо ад гэтага залежыць далейшае жыцьцё «Беларускіх Ведамасьцей». Хто ня ўмее чытаць, хай просіць, каб яму прачытаў пісьменны сусед, або настаўнік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы. Зьбірайцеся грудам і чытайце разам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы. Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і сацыяльных ворагаў і працуець над разьвіцьцем роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць адну марку на агульную народную справу. Браты, прыміце блізка да сэрца ўсе гэтыя словы! Настаўнікі, пільнуйце, каб «Беларускія Ведамасьці» ў вашым раёне выпісываліся і пашыраліся.

Хай жывець народная справа!

Адрэс: Wilno, Ostrobramska № 9, „Беларускія Ведамасьці“.

Зьезд арганізацыі „Краевая Сувязь“. (Аляксюкоўцаў)

Адбыўся ў Вільні 11—12 сьнежня зьезд, скліканы „Краёвай Сувязьзю“ з падабраных польскіх агентаў і некалькіх прывезеных гэтымі агентамі з вёскі людзей. Усе прамоўцы стараліся гаварыць пабеларуску, хаця многіх выдаваў польскі акцэнт. Віднейшых віленскіх беларусаў на зьезд ня пускалі навет як публіку. Вядомага ксяндза-беларуса А. Станкевіча выкідаў „сам пан Аляксюк“, каторы быў дагэтуль досыць пачцівым каталікам. Якога-сь студэнта-беларуса пабілі. Моцна зьняважылі і сябра Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту грам. Пракулевіча, які пайшоў для цікаўнасьці. Рэзалюцыі прыймаліся наўмысьля ў беларуска-сялянскім тоне, а хітра ахаваным польска-панскім духам: можа, хто й паверыць!

Трэба адзначыць, што ад беларускай нібы-то прэсы меў бясстыдства вітаць зьезд п. Нялепка, які ўжо ізноў каяўся ў „Jednaści“.

Наагул-жа зьезд прайшоў мала замечаны ў Вільні, навет беларускім грамадзянствам.

Шмат яшчэ прыдзецца папрацаваць ворагам беларускага народа, каб выдаць дзе трэба голас аляксюкоўскага зьезду за голас беларусаў Віленшчыны. Але гэта ім, бязумоўна, ня ўдасца.

Праграная стаўка.

Пытаньне аб тым, ці йсьці на выбары у Віленскі Сойм, ці ня йсьці, разьдзяліла грамадзян нашага краю на два варожых лагеры.

Ідуць на выбары — палякі.

Ня йдуць—беларусы, ліцьвіны і жыды.

Матывы, па якіх ня йдуць на выбары гэтыя апошнія, зводзяцца галоўным чынам да таго, што выбары — не свабодныя, што мэтай іх зьяўляецца: тым ці іншым спосабм далучыць Віленшчыну да Польшчы.

Інтарэсы беларусаў, ліцьвіноў і жыдоў ігнараваліся і ігнаруюцца, а той, хто забраў наш край аружжам, ня лічыцца з воляй усіх жыхараў краю, а толькі са сваёю воляю.

Згоды паміж палякамі і іншымі нацыянальнасьцямі краю няма і быць пакуль што ня можа, бо відаць, што палякі гэтай згоды ня шукаюць, а калі і шукаюць то ня шчыра.

І вось мы бачым, што ў Сойм ідуць толькі палякі, ды й то, мабыць, ня ўсе.

Адшчапенцы з беларускага, а быць можа і з жыдоўскага боку, якія зьбіраюцца йсьці на выбары, ня могуць быць узяты пад рахунак, бо людзі гэтыя працуюць дзеля сваёй асабістай карысьці і не карыстаюцца аніякім аўтарытэтам сярод шырокіх кругоў грамадзянства. За імі народ ня пойдзе.

Такім чынам, за Сойм стаіць польская меншасьць і, значыцца, Сойм ня будзе праўным.

А калі так, то Віленскі Сойм ні ў чыіх вачах не будзе мець ніякай вагі, і стаўка на Сойм будзе безварункова праграна.

БЕЛАРУСЬ пад МАСКОЎШЧЫНАЙ.

(Па ведамасьцях менскіх газэт).

Выстаўка старадрукарскіх кніжак у Вітабскім Архэолёгічным Інстытуце.

З пачатку кастрычніка гэтага году ў пакоях Вітабскага Архэолёгічнага Інстытуту адчынілася выстаўка рукапісных і старадрукарскіх кніжак.

З габінэту старадрукаваных кніжак Інстытуту, дзе іх маецца каля 10 тысяч, былі атабраны найбольш цікавейшыя, пачынаючы з пісаных уставам, палуўставам, скорапісьсю інкунабул (перш-наперш надрукаваных кніжак у 14 ст.) і кніжак 15, 16, 17, 18 і пачатку 19 сталецьцяў.

Заданьне выстаўкі было паказаць эпоху разьвіцьця друкаванага слова ня толькі ў нас на Беларусі, але і наогул у Эўропэйскіх нацыях. Так побач з беларускімі старадрукаванымі кніжкамі, Літоўскім Статутам, кніжкамі друкаванымі ў Віленскай, Полацкай і Арціачскай друкарнях і іншымі, прадстаўлены кніжкі Заходня-Эўрапэйскага друку: грэкаў, рымлян, палякоў, немцаў, французаў, езуітаў (на лятынскай мове).

Слухачам Інстытуту быў зроблен каротки нарыс разьвіцьця друку. Асабліва зьвярталася ўвага на разьвіцьцё друку на Беларусі. Многіх дзівіла, што былі кніжкі дужа маленькія, з паўтары цалі, і такія вялікія, што адну кніжку досыць нясьці дужаму чалавеку.

Выстаўка ў Вітабску беларускага друку.

Неўзабаве адкрываецца ў Вітабскім Архэолёгічным Інстытуце выстаўка друку беларускага пісьменства, дзеля чаго кніжкі Інстытуцкай бібліятэкі папоўнены беларускімі кніжкамі прыватных асоб.

Гэтая выстаўка будзе адчынена дзеля ўсіх грамадзян м. Вітабску.

У пакоях выстаўкі прафэсарам М. В. Мялешкам будуць прачытаны лекцыі па гісторыі беларускай літэратуры і друку.

З Магілеўшчыны.

Магілеўскі Беларускі культурна-асьветны Гурток „Асьвета" прыслаў гарачае прывітаньне першаму Беларускаму Універсытэту ў Менску.

Савецкая Беларусь.

(Па ведамасьцях менскіх газэт).

Помач галадуючым расейцам.

Менская гарадзкая камісія па дапамозе галадуючым была арганізавана ў верасьні месяцы г. г. і да 17 лістападу часу правяла вось якую працу. Арганізавала і правяла ў Менску „Тыдзень дапамогі галадуючым", праца па падліку якой яшчэ ня скончана. Да гэтага часу атрымана 155.000.000 руб. і значны лік харчоў, якія перададзены ў Ц. К. па дапамозе галадуючым. Апрача „тыдню", сабрана ад гандляроў 200 п. мукі і 45.000.000 руб., ад прыватных млыноў 42 п. жыта, ад пекароў 5.000.000 руб.

Што датычыць адлічэньняў у агульна-гарадзкім маштабе, дык яны здаюцца ў Ц. К. па дапамозе галадуючым. Агульны лік атрымліваемых харчоў і грошаў досыць значны.

У цяперашні час праца гарадзкой камісіі пашыраецца. Пачата плянавая і заўсягдышняя дапамога галадуючым. Праводзіцца ў жыцьцё цыркуляр Ц.К. па дапамозе галадуючым пры У. Ц. В. К. заўсягдышняй дапамогі сярод дамовых камітэтаў. Адлічваецца значны лік харчоў і грошаў ад млыноў, пякарняў, мясьнікоў, калбасьняў. Апрача гэтага маецца на ўвазе рад мераў да магчыма большага здабытку харчоў і дасягненьня добрых вынікаў у заўсягдашняй дапамозе галадуючым.

Беспартыйная канфэрэнцыя 3-га раёна міліцыі Заходн. чыгунак пастанавіла адлічыць па 2 ф. мукі ад кожнага да жніўня месяца 1922 году, да новага ўраджаю.

Ад Вяліка-Долецкай вол., Барысаўскага павету, атрымана на карысьць галадуючых ад Царковінскага сельскага савету бульбы — 9 п., гароху — 1 п. 33 ф., ячменю — 1 п. 16 ф. і грашмі 49158 руб. і ад Вяліка-Долецкага сельскага савету бульбы — 23 п. жыта — 1 п. аўса — 1 п. і 17 ф., Зембінскага — 9 п. жыта і ячменю. Старынскага — 5 п. гароху і 2. жыта. Каапэратывам загатоўлена больш 300 п. хлеба, але за адсутнасьцю фурманак няма магчымасьці адправіць на прыёмачны пункт.

Бабруйск сабраў на галадуючых 76 міліёнаў.

8-га лістапада на бягучы шчот павятовай камісіі па дапамозе галадуючым у грашовы аддзел здадзена камісіяй па дапамозе галадуючым пры саюзе металістаў — 1 532 120 р. ад народнага судзьдзі 8-га вучастку — 70 0000 р., 8-га вучастку — 200000 р., Усяго з атрыманымі ўперад 76357142 рубл.

Тэатральная дзейнасьць Галубка.

Вядомы драматург і артыста У. Галубок, як відаць з паведамленьняў газэты „Савецкая Беларусь", працуе цяпер рэжысэрам у 2-ой Менскай Беларускай Трупе, якая знаходзіцца пры Раб. Белар. Клюбе (Юраўская 19).

Зьмяншэньне штатаў у Менску.

Праўленьне саюзу Працаўнікоў Асьветы Беларусі прапануе ўсім сябром Саюзу, звольненым са службы ў зьвязку са зьмяншэньнем штатаў, зарэгістравацца ў Саюзе, як безработным.

Электрычнасьць у Жыцінскай воласьці.

„Савецкая Беларусь" (№ 367) паведамляе: Бабруйскай павятовай эканамічнай нарадай зацьвярджаюцца з некаторымі папраўкамі ўмовы на здачу лёкамабіляў у арэнду. Лёкамабілі ў большасьці выпадкаў арандуюцца для абсталяваньня млыноў. Толькі адзін прадпрыемца мае замеры ўзятым у арэнду лёкамабілям асьвяціць электрычнасьцю мясцовасьць Жыцінскай воласьці. Апрацаваны ім плян мае правесьці электрычнасьць у 8 вёсак і 1 маёнтку, куды будуць праведзены лініі большай і меншай моцы, абсталяваны трансфарматары і г. д. Скарыстаўшы такім чынам лёкамабіль, ён дасьць штырхач да правядзеньня электрычнасьці ўва ўсім павеце.

Фрытыоф Нансэн.

У газэце „Савецкая Беларусь" (№371) знаходзім вельмі цікаўнае апісаньне пераезду камісара помачы галадуючым расейцам Фрытыофа Нансэна праз Беларусь, якое тут у скарачэньні і падаём.

Сустрэча Нансэна на Савецкай тэрыторыі.

19-га лістапада для сустрэчы Фрытыофа Нансэна выехалі асобным поездам у Негарэлае Старшыня Беларускага Чырвонага Крыжу Баркусевіч і прадстаўнік Народнага Камісарыяту Замежных Спраў Беларусі Ітві.

Вітаньні.

Ітві ў сваей прамове на францускай мове адмеціў высокую мэту Нансэна і яго заданьне нарыхтоўкі дапамогі галадуючым Паволжа.

Нансэн, змагаючы ўсякія перашкоды, узяў у свае рукі справу дапамогі галадуючым Паволжа. Расейскі селянін і рабочы, а так сама сотні тысячаў галадуючых дзяцей і матак з пачуцьцём глыбокай падзякі будуць успамінаць Фрытыофа Нансэна. На нямецкай мове ад імя Беларускага Чырвонага Крыжу вітаў Баркусевіч.

Нансэн.

Нансэн сказаў вялікую прамову па францускy, зазначыўшы свае добрыя адносіны да Савецкіх рэспублік і дэклярyючы натужыць усе свае сілы ў справе помачы галодным. Ен спадзяецца дабіцца таго, што з помаччу прыдуць усе заходня-эўрапэйскія дзяржавы, прычым паведаміў, што ў яго ўжо ёсьць надта вялікія кошты ахвяраваньняў для Расеі, як ад ураду Англіі, так і ад усякіх грамадзкіх гурткоў, у тым ліку 200 тысяч гульдэнаў, ахвяраваных галяндзкімі работнікамі. Але ўсё-ж Нансэн адзначыў, што поўнай дапамогі ня можа быць, бо ў Эўропе пануе цяпер вялікае безрабоцьце.

У далейшай гутарцы ў сваём салёне—вагоне з Беркусевічам і Ітві Нансэн вельмі цікавіўся эканамічным становішчам Сав. Расеі і Беларусі, становішчам транспарту, пытаньнем аб уцекачох і інш.

На парозе новых крывавых здарэньняў.

Сёньня—сказаў Нансэн —атрыманы весткі з Сэрбіі аб вайне яе з Албаніяй. Дзяржавы Антанты ня думаюць падбухтораваць да гэтай новай вайны і хочуць абедзьве бакі ўзяць пад блёкаду, але што з гэтага выйдзе—няма ведама. Але без узнаўленьня эканамічнага жыцьця Расеі, без нарыхтоўкі дапамогі галадуючым, наладжаньне эканамічнага жыцьця ў Эўропе—немагчыма.

Фрытыоф Нансэн заявіў, што ён апалітычан, але мае быць злосным ворагам усякіх войнаў.

Страшэннае становішча уцекачоў.

У прамове Ф. Нансэн крануўся страшэннага становішча расейскіх уцекачоў у Канстантынопалі, дзе іх маецца каля 200 тысячаў чалавек. 10 тысячаў можна лічыць, павінны будуць памерці галоднай сьмерцьцю. Нансэн мае на ўвазе хадайнічаць перад Урадам РСФСР, аб дазваленьні гэтым уцекачом вярнуцца к сабе на бацькаўшчыну ў Савецкую Расею. Ім так сама будзе вырашана пытаньне аб звароце з Францыі, Алжыру і Марокко 5 тысячаў расейскіх салдатаў і матросаў, якія перакінуты туды старым царскім урадам.

Становішча гэтых людзей вельмі цяжкое.

Амністыя.

Баркусевіч адзначыў амністыю, якая абвешчана Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам у выпадку Акцябрскай Рэвалюцыі, падкрэсліўшы, што савецкая ўлада ня мае помсты, яна не вінавата ў іхных мучэньнях, яна кліча іх вярнуцца на бацькаўшчыну.

Нансэн заявіў, што яму вядом маніфэст аб амністыі, і ён знае, што Савецкая ўлада невінавата ў бядзе ўцекачоў, што ён са задавальненьнем сьведчыць.

Падзяка беларусам.

Нансэн з глыбокім пачуцьцём падзякі падкрэсліў цёплае спатканьне, якое зрабілі яму на тэрыторыі Савецкай Беларусі.

У Менску.

У 9½ гадзін у вечары Нансэн прыехаў у Менск; на вакзале яго спаткаў Народны Камісар Асьветы Беларусі Ігнатоўскі. На вакзале сышлося многа народу. Салён-вагон Нансэна абвакольваецца шчыльна чырвонаармейцамі, чыгуначнікамі і рабочымі Аляксандраўскай чыгункі. Нансэна вітае ад імя Савету Народных Камісараў Беларусі і Беларускага Унівэрсытэту Ігнатоўскі. У адказнай вітальнай прамове Фрытыоф Нансэн просіць перадаць свае лепшыя пажаданьні беларускім рабочым і прадстаўнікам працаўнікоў Беларусі—Савету Народных Камісараў ССРБ.

Фрытыоф Нансэн скорым поездам паехаў у Маскву.

П. П. С. і „unarodowienie" польскага гандлю.

Што банкір, фабрыкант, наогул, капіталіст могуць быць добрымі партыйнымі сацыялістамі і навет лідэрамі—аб гэтым сьведчыць практыка многіх сацыялістычных партыяў. Але каб афіцыяльны ідэёвы орган сацыялістычнай партыі заклікаў сяброў пралетарыяў ісьці ў акцыянэры капіталістычнай супалкі, ды яшчэ для барацьбы за нацыянальны гандаль—да гэтага дайшоў пакуль што толькі орган польскай сацыялістычнай партыі (П. П. С.) „Работнік".

У № 327 гэтай газэты чорным па беламу за подпісам рэдактара замешчана абвестка вялікай польскай гандлёвай супалкі „Пяст". Супалка гэтая ў доўгай і красамоўнай, як казаньне з амбоны, абвестцы распісывае канечнасьць здаровага гандлю і ў канцы—заклікае да „мазольнай працы": „зараз стаць у рады нашых прыхільнікаў „unarodowienia" польскага гандлю" і запісацца на акцыянэра.

Што павінен зрабіць польскі пралетары-сацыяліст, прачытаўшы гэтую абвестку ў сваім паважаным партыйным органе: ісьці ў рады капіталістаў (як раз і акцыі-даступныя, толькі 1.100 марак), ісьці за ўмацаваньне нацыянальнага капіталістычнага гандлю?

Хацелась-бы запытаць, ці для П. П. С. ня зьяўляецца абавязковай агульна-сацыялістычная формула работніцкага руху, па якой партыя, прафэсіянальны саюз і каапэратыў—ёсьць тры шляхі пралетарскага вызваленьня. Ці партыя не жадае ад сваіх сяброў абавязковага належаньня да работніцкіх каапэратываў.

У такім выпадку ня вельмі падзякуе „Работніку" польская работніцкая каапэрацыя за агітацыю на карысьць капіталістычнай супалкі, якая зьяўляецца першым ворагам і работніцкай каапэрацыі і работніцкага руху, а маючы на ўвазе „unarodowienie" гандлю, рыхтуецца загнаць клін нацыянальнай розьні і сярод працоўных масаў.

Няўжо-ж „Работнік" падзяляе і гэтае становішча, г. з., барацьбу з ня польскім гандлем, у першы чарод, знача, з яўрэйскім?

Зусім зразумела, калі гэты выпадак, замешчэньне абвесткі капіталістычнай супалкі „Пяст"—толькі недагляд, толькі памылка. Але калі П. П. С. паважна гаворыць, што трэба заклікаць польскага сацыялістычнага работніка на „мазольную працу" ў капіталістычныя супалкі і што працоўным масам трэба ўцягівацца ў барацьбу за нацыянальны капіталістычны гандаль, тады справа вымагае паважнейшага высьвятленьня.

Пэўна што беларуская сацыялістычная думка з гэтым паглядам на справу ня згодзіцца.

Ігнат Абдзіраловіч

Дурны вучыцель.

(К сталецьцю нарадзін Ф. М. Дастаеўскага).

Відзелі вы калі-небудзь у Горадзе (так называюць нашы людзі павятовае места Мсьціслаўль) дурнога вучыцеля?

Ніводзін кірмашовы дзень без яго не абойдзецца. Ды й у звычайныя дні ён часам басьцяецца па рынку і наводзіць страх на перакупак і забаўляець сваімі дзівосамі крамнікаў.

Дурны вучыцель нікога не чапаець, ні з кім ня сварыцца, ніколі не скандаліць.

Ходзіць сабе спакойна між народу, прыглядаецца да прыезных сялян, шукаючы знаёмых, каб папрасіць чаго есьці.

Праўда, выглядаець бедны, як і ўсякі дурны. Апранены ў нейкі шабадраны балахон, няголяны, валасаты, з даўгімі, чорнымі ад гразі кіпцямі, вочы ў яго пачырванелыя, змучаныя, неспакойныя. Ніразу не глядзіць ён проста на другога чалавека, а ўсё ўхіляецца некуды, як-бы шукаець чаго ці прыглядаецца на што па-за плячмі ў вас. Цалюткі дзень, ад раньня да позьняга, шарпаець сваімі апорачкамі па тратуару ці па каменьню. Бываець так, што і ў ночы бродзіць ды гамоніць з вартаўнікамі.

Гаворка яго ня дурная. Што ён кажаць, то усё-чыста можна разабраць.

Але затое страх наводзіць на перакупак, што найчасьцей іх умаўляець: „Сястрыцы, Бога няма, да-душы няма."

А крамнікаў забаўляець тым, што плюець на цэрквы.

—Гаспадзін вучыцель!—скажаць яму які-небудзь Шмуйла ці Ірша.—Гаспадзін вучыцель! Гарадавога блізка нет: на! бублік, плюнь на цэркву!

Ен паглядзіць у той бок, гдзе гарадзкі сабор ці Тупічаўскі манастыр, зьбярэць сьлюню і плюнець. Моўчкі возьмець бублік і есьць. А дурні рагочуць.

Як часам надта лезуць яму ў вочы, то нічога не бярэць ды яшчэ й крыкнець: „Глядзі! Плюю на вашу школу"... зьбярэць сьлюню і плюнець у той бок, дзе яўрэйская сінагога. Ох, крамнікі тады пужаюць: „Гарадавой ідзёт! Гарадавой ідзёт".

Ды вучыцель, вядома дурны, нічога не баіцца: ён плюнець на царкву, на касьцёл, на сінагогу—хоць-бы на воку ў самага цара ці губэрнатара. Яго і не чапаюць. Спрабавалі паняволіць год ці болей у вайстрозе: нічога рады не далі, —плюецца! Толькі чалавек ён ня крыўдны. Папросяць гарадзыя, каб пры іх хоць ня плюваўся, ён і паслухаець, пры іх высьцярагаецца, каб прыкрасьці ім ня было.

Дык вось-жа гэты самы «дурны вучыцель», як цяпер усе яго празываюць, ці пан Якуб Цімохавіч Нос-Насовіч—быў раней вучыцелем у нашым у сяле і захварэў, вучыўшы ў нас, так што ведаем усю яго нешчаслівую гісторыю.

Перавялі яго да нас з другія школы, бо не паладзіў там, казалі, з бацюшкам..

Вядома, у той час настаўнікі з бацюшкамі часта сварыліся. Калі ня хочаць настаўнік памагаць дзяку ў царкоўнай службе, ці ня дужа нізка пакланіцца матушцы, ці так чым не спанравіцца папу й яго сям'і (напрыклад, на хочаць хадзіць да пападзянак сьмешкі строіць), то зараз на яго папера й паляціць.—„Так і так, настаўнік тутэйшы ёсьць вольнадумец, у царкву ня ходзіць, Богу ня моліцца, начальнікаў не шануець, дзяцей не навучаець"... Трах, і перавядуць у другую, горшую, школу, або й зусім яго скінуць далоў з настаўніцтва.

Мабыць, такім манерам перавялі й пана Якуба.

Прыехаў ён да нас у поўным розуме і стаў вучыць дзяцей, прыглядацца да народу. Нічога, усё пайшло як найлепей. Дзеці яго палюбілі, бацькі былі здаволены, што дзяржыць іх у школе да цёмнага, ня тое што цяпер другі: не пасьпеюць бабы абед згатовіць, а ён школьнікаў ужо дамоў пусьціў... Сьвяшчэньнік у нас быў тады—старэнькі бацюшка па прозьвішчу Арыстарх Бекарэвіч, хай сьвят ляжыць. Дужа слаўны быў бацюшка. Даступны, гаманлівы, дзяцей умеў лячыць, з бедных за адправы нічога ня браў. Бывала незаможныя маладыя з другіх парахвій вянчацца ў наша сяло прыяжджалі. Упадобіў вучыцеля і войчанька Арыстарх. Рыбу лавіць ці ў ягады—разам хадзілі. Адно дакучала старому: надта любіў вучыцель гаманіць з ім аб тым, як трэба верыць у Бога. Той дзесятак плотак пасьпее на вуды падчапіць ці поўны кош баравікоў сабраць, а пан Якуб яшчэ толькі аб сатварэньні сьвета пачынае...

Ацец Арыстарх, як і пан Якуб, быў чалавек адзінокі; жыла ў яго за гаспадыню толькі адна нейкая далёкая сястра ці швагрэньня. Жанчына гэтая, у размовах аб веры ды аб Богу й падмяніла для вучыцеля бацюшку. А была надта начытаная ў кнігах. Вечна яны, бывала, сьпіраюцца. Ацец Арыстарх слухаець іх, слухаець ды й пойдзе спаць. А яны памянуць і Бога Хрыста, як той казаў, і лазовага куста!..

Вось тады, мабыць, і пачалася ў пана Якуба хвароба розуму. Забраў сабе лішнее ў галаву чалавек. Не хадзіў ні на скокі, ні на йгрышчы, ня любіў займацца ні с паненкамі, ні ў карты. Толькі яго й занятку: адпусьціць школьнікаў і йдзець да паповае швагрэньні на „дыспутасы" ці садзіцца за свае філязофскія кнігі і шукаець да шэрага раньня адгадак, адкуль усё і што яно?

Сядзеў ён так, сядзеў гадоў з пяць, здаецца, покуль быў у нас настаўнікам, і патроху стаў рашацца галавы.

Дзейкалі ў нас людцы, што ў аднаго старога лясьніка, каторы-такі запраўды ўмеў зьнімаць хваробы ці паддаваць іх і наагул займаўся чараўніцтвам, што ў гэтага лясьніка ёсьць Брусаў календар. Вялікая кніга з аракулам, з рысункамі розных рагатых, ня проць ночы будзь казана, адным словам, з усякай чараўніцкай пошкудзьдзю.

Дачуўся аб кнізе пан Якуб і пайшоў да лясьніка. Схадзіў раз, другі, і трэці, а чым далей, тым болей учашчаў.

І людцы сталі патроху наракаць на яго, што ня пільнуець толькі школы, а лезець у тое, у ва што лезьці настаўніку не выпадае.

Ды вядома, як унадзішся, то й рады сабе не дасі.

Так і з нашым вучыцелем.

Падвучыў яго пракляты лясьнік зрабіць так, як спрадвеку ўмеюць рабіць нашскія чараўнікі, ды накладаюць затое галавою.

Хіба-ж кожны ведаець, чаму ў іншага лясьніка хоць-якая нягодная стрэльба дастаець у лёт самую шпаркую птушку? Або чаму самы бедны гарапашнік ані з тога, ані з сёга раптам робіцца багатыром на ўсю ваколіцу?

Таму, што яны, як прычашчаюцца, не праглынуць кашкі, а задзержуць яе ў роце, посьле выймуць у хустачку і схаваюць. Выбраўшы чараўніцкую часіну, ідзець такі-каторы з паўночы ў лес, у самыя глухія нетры, прывяжаць хустачку з святою кашкаю на асінавым суку (затое, што на гэтым дрэве Юда задавіўся) і, хай нас Бог сьцеражэць,—страляе ў Цела Хрыстова.

Як стрэліць той-каторы бязбожнік сваёй стрэльбаю, то разам асьвеціцца яму ўся-чыста пушча няземным, як-бы ад вялізнае маланкі, сьлепячым грэшныя вочы сьвятлом, сьціхне з...

Злучэньне Саюзаў Каапэратываў.

Апошнія два — тры месяцы шмат гаварылі пісалі аб злучэньні ўсіх краёвых Саюзаў Каапэратываў у вадзін Агульнакраёвы. Гутарку аб гэтым пачаў прысланы з Варшавы прадстаўнік польскай каапэрацыі—Вольскі, яшчэ на Зьезьдзе Віленскага Саюзу Каапэратываў у красавіку (маі) гэтага году. Скора праз абмылку запрошаны ў Саюз і прыехаўшы ў Вільню інструктарам у Віленскі Саюз Каапэратываў, гэны пан усю сваю працу скіраваў на добрае з першага пагляду дзела, як злучэньне.

У верасьню быў зроблены зьезд прадстаўнікоў усіх Саюзаў, якія толькі ёсьць у краі: Саюзаў Віленскіх, Лідзкага і Наваградзкага. На зьезьдзе Вольскі дамагаўся, каб як найхутчэй, амаль ня гвалтам, былі злучаны два Саюзы: Віленскі Саюз Каапэратываў і „Зьвёнзак Земі Віленскай“ п. Турскага—арганізацыя шавіністычна-польская.

Віленскі Саюз Каапэратываў ня маючы нічога супроць стварэньня Агульнакраёвага Саюзу, неахвотна ішоў на злучэньне толькі з адным „Зьвёнскам Земі Віленскай“, глаўным чынам, дзеля таго, што гэтым не дасягалася злучэньне усёй спажывецкай каапэрацыі. Як вядома, Польскі Урад штучна зробіў „Цэнтралю Стоважышэнь Рольніча-Гандлёвых“,—арганізацыю Стражы Крэсовай, канкурэнтам Віленскаму Саюзу, бо гэта Цэнтраля раскідывае сваю дзейнасьць не на горад, як саюз Турскага, а глаўным чынам на вёску і конкуруе такім чынам з Віленскім Саюзам, гандлюючы ня плугамі і баронамі як яму належала-бы, а сольлю, нафтай, селядцамі і іншым, чым займаецца звычайна толькі спажывецкая каапэрацыя.

Тымчасовая Урадовая Камісія Літвы Сьродковай гэтай Цэнтралі давала міліённыя дапамогі, а Дэпартамант выдаваў соль, нафту і інш. тавары нараўне з Саюзамі Спажывецкай Каапэрацыі.

Апроч „Цэнтралі Рольніча-Гандлёвай“, вядзе сваю шкодную працу таксама штучна зробленая «Краёвая Сувязь»-арганізацыя польскага найміта Аляксюка. Гэта «Сувязь» таксама арганізовывае каапэратывы, атрымлівае вялікія дапамогі ад Ураду, а ад Дэпартамэнту Апразізацыі прадукты: соль, нафту, цукер і г. д.

Вольскі дамагаўся, каб пры злучэньні навет толькі з Саюзам „Земі Віленскай“ быў саўсім зьнішчожаны статут Віленскага Саюзу Каапэратываў і ўсе органы гэтага Саюзу, а каб былі выбары новай Рады і Управы і многа іншых зьмен, якія саўсім зьніштажалі Віленскі Саюз Каапэратываў.

Каапэратар.

Перад выбарамі.

„Беларускі голас“ піша аб выбарах у Віленскі Сойм:

Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні падаў свой голас аб іх, а гэта—голас усяго арганізаванага беларускага грамадзянства, усіх беларусаў, якія не прадалі свайго сумленьня і, не баючыся кар і перасьледаваньня, сказалі ясна і адкрыта слова праўды.

Мы-ж паглядзімо, дзеля чаго склікаецца Сойм пры такіх ненармальных варунках і на што ён так патрэбен палякам.

Вядома, што увесь сьвет у асобе Лігі Народаў ужо зрабіў сваю пастанову аб Віленшчыне. Пастанова гэта кажа, што Віленшчына, як асобная самаўпраўная адзінка (кантон) павінна быць злучана з такой-жа самаўпраўнай Ковенскай адзінкай у адно гаспадарства—з тым, што кожын з гэтых двух кантонаў будзе сам сабе гаспадаром. Ведама, пры такой разьвязцы Віленскага пытаньня ў Віленскім кантоне ўзялі-б верх беларусы: тут наша лічэбная перавага, дый тыя тысячы польскіх навазных чыноўнікаў, якім цяпер даецца права голасу на выбарах, хоць яны ня тутэйшыя—чужынцы, прымушаны былі-б вярнуцца дамоўкі—да Полшчы. Вось, дзеля гэтага польская улада „Сярэдняй Літвы“ ды так сама і польскі урад у Варшаве ні за што ня хочуць надлацца пастанове Лігі Народаў. Іх мэта—проста далучыць Віленшчыну да Польшчы, пазбавіўшы нас усялякага самаўпраўленьня, а тады нашы паслы ў Варшаўскім Сойме зусім ня мелі бы сілы супроць вялізарнае масы палякоў. Тады, ведама, і ўся наша гаспадарка асталася-б у польскіх руках, і польскія паны, якія цяпер сядзяць на „сярэдня літоўскіх“ урадах, захавалі-бы на векі вечныя ўладу над Беларускім Народам.

Ф Багушэвіч

Дурны мужык, як варона.

Весь сьвет кажа, б'ець у звоны:
„Дурны мужык, як варона“
Гэта-тыкі справядліва:
Ен дурнейшы ад вароны,
І ня дзіва — было-б дзіва,
Каб мужык, ды быў вучоны.
Дык крычыце-ж, біце ў звоны:
Дурны мужык, як варона.
Да навукі ён ня браўся,
Закасіўся, загараўся;
Дурнем умрэ, як радзіўся,
Сам сабой дурным зрабіўся
Ведама, мужык — хамула, —
Ад навукі адвярнула!
Дык крычыце-ж... (як раней).
Ці-ж ня дурань мужык гэта
Гарэ, сее усё лета,
А як прыйдуцца дажынкі,
Няма збожжа ні ясьмінкі,
А даждаўшы на Каляды,
Мужыкі мякінцы рады
Дык... (як раней).
Усю зіму возам цягне
Да вагзалу рожна збожжа.
Ногі зьмерзнуць, сам васьмягне.
А на хлеб кажух заложа,
Каб дажыць як да крапівы,
Абы ў поле выйшаў жывы.
Дык... (як раней),
Ад Пятра і да Якуба
Ен касой махаў ад раньня
Наклаў стагоў, людзям — люба
У хаце-ж сена — ані званьня.
Равець з голаду скаціна,
Хоць, кінь, бяжы за вачыма!
Дык... (як раней).
Глядзі, касьцёл аж да неба,
Воласьць бляхамі пакрыта!
Срэбрам скрые, калі трэба,
Бо за гэта яго біта,
А сам жывець ў мокрай яме
Дзьверы заткнуў анучамі!
Дык... (як раней),
З камаровы нос сякерку
Спісьне, крэкне, замахае, —
Зробіць пушчу, як талерку,
Сьвет дравамі закідае!
А у хаце зварыць страву,
Папчапае стару зяву!
Дык .. (як раней).
Глядзі, горы паразрыты,
А чыгункай сьвет абвіты.
Усё з мужыцкай цяжкай працы,
Усе едуць у палацы;
У мужыка-ж няма білета!
Ці-ж ня дурань мужык гэта?
Дык крычыце-ж, біце ў звоны.
Дурны мужык як варона!

У. Неўсці

Мне знаць.

Што-ж, куплеты, дык куплеты.
Мы таксама можам сьпець,—
Хоць з нас простыя паэты..
Дык прашу-ж не чырванець!
Для прыкладу возьмем панну
У рукавічках, твар гарыць,
Пекната і гібкасьць стану
Можа вас завараджыць.
„Цо“ ды „вешч“ танцуе вальсы,
Крышку ўмее і чытаць..
Сколькі-ж ўсёй абману й фальшы,
Тое мне дазвольце знаць!
Вось і пан... народ так ціснe,
Абзывае ўсіх „скатом.“
Перад ім ніхто й ня пісьне.
Навет сам пан-аканом.
„Ну, такая ўжо краіна,—
Кажа пан што трэба драць...“
А які ён сам скаціна,
Гэта мне дазвольце знаць!

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

М. **Вязынь** Вялейскага павету.

Кепска, надта кепска пастаўлена ў нас школьная справа. Акром таго, што ў нас ня пыталіся, якую школку адчыніць, ці беларускую, ці польскую, бо ў нас у воласьці, акром войта, яго памоцніка і сэкратара, нікога няма, але далі нам вучыцелек, каторыя нічагусенькі ня цямяць пабеларуску, напрыклад, у Латыгалі, вучыцелька — пазнанка папольску гаворыць быстра, і чалавеку, каторы і знае троху папольску, трудна яе паняць, а як будуць дзеці слухаць яе лекцыі, Бог знае; дзеці ня знаюць папольску, а вучыцелька пабеларуску.

У Вязыні ў быўшай 2-х клясовай школцы ёсьць вучыцель і вучыцелька — яго жонка; гавораць з вучанікамі і папольску, і парускy і пабеларуску, — згаварыцца могуць, але вучанікам далі пачатковыя да чытаньня кніжкі, у каторых большая іх частка надрукованы польскія малітвы, а каталікоў у нас, можна сказаць, зусім няма. Гэта, мусіць, хочуць перасьвяціць праваслаўных вучанікоў на каталікоў

Ня лепей ад школьнага дзела стаіць у нас дзела мэдыцыны. На цэлы Вялейскі павет ёсьць павятовы доктар п. О., але-ж яго і днём з агнём ня найдзеш; посьле, павет падзелен на раёны, і ў кожным раёне ёсьць доктар. Вязынская воласьць належыць да раёна Ільля, якім ведае доктар п. Х Гэты доктар такі дарагі, што бяз 1500 марак на хворага і не паглядзіць. Беднага, кепска апранянага хворага гэты доктар усё роўна мацае кастылём, бо надта брыдзіцца бядноты. Дзеля гэтага ў нас у м. Вязыні быў хвельчар І. К., каторы добра цяміць па хваробах і меў малую аптэчку. Лячыў ён нас з 1917 г., і вось надоячы да яго прыехаў раённы доктар п. Х. забраў у яго ўсе мэдыкамэнты, напісаў пратакол і сказаў яму, што без пазваленьня Наваградзкага ваяводы ён ня мае права лячыць, а цяпер тым бардзей, што аддадзены пад суд. Цяпер, калі чалавеку забалеў жывот, то трэба ехаць у Вялейку 21 вярсту, каб купіць рыцыны, ці за 7 вёрст у Ільлю да гэтага нашага доктара Х.

Быў у нас каліcь надта добры да вайны млын п. Гічэвіча; і ні адзін млын, а пры ім цэлая хвабрыка. Тут выраблялася ўсё тое, што трэба на вёсцы: валюш, воўначэска, маслабойка, гантарня, тартак, розныя круперні, пытль, і каменьне для памолу простага. Была тут і дынэма і некаторым давала сьвету ў хаты. Пры апошнім адступленьні палякоў млын спалілі, а мост узарвалі і спалілі. Цяпер п. Гічэвіч хоча зрабіць яго на нова, але свaей сілы ня мае, дык вось удаўся, як відаць, да адміністрацыі, каторая 6. XI г. г. сабрала ў воласьці сход салтысоў і заказала рабіць мост; дрэва дасьць п. Гічэвіч, але рабіць яго павінны грамадзяне. Як будзе далей, ня ведаю, але-ж грамадзяне не згаджаюцца на гэта.

У першых днях кастрычніка г. г. была ў нас перапісь насяленьня, але-ж ня толькі аднаго насяленьня, а і трусоў і курэй. Куры мусіць служаць у гэтай перапісі галоўным пунктам, бо некаторыя перапісчыкі днём курэй запісывалі, а ноччу прыходзілі паверадь, ці ўсе куры запісаны. Гэтак было ў вёсках Лугавыя і Рыбчанцы нашае воласьці. Калі здаралася, што ноччу курэй у гаспадара было болей, як запісана, то перапісчык абяцаў гаспадара арыштаваць, пасадзіць, налажыць „штраф“, пакуль гаспадыня ці „сьпявіўшы дзела“, давала перапісчыку яец, масла ці сала, а гаспадар грошаў, і тым страх гэты і канчаўся. Але-ж посьле ў справу ўмяшаўся сам наш раённы і паслаў гэтых перапісчыкаў туды, куды яны абяцалі пасадзіць тых гаспадароў, каторыя кралі ад іх курэй.

Гэта-ж так было ў нас толькі на вёсках, а у мястэчку перапісчыкі былі надта дэлікатныя людзі: зайшоўшы ў хату, казаў „dzień dobry“, зьнімаў пальто і садзіўся пісаць. Пытаўся, якія мы, ці палякі ці беларусы і запісываў відаць добра. Але-ж усё гэта, мне здаецца, нятак важна, а важна вось што: апросны ліст вялікі, такі вялікі, як газэтны аркуш паперы; складаецца ён у чацьвёра; страніцы яго запаўняюцца ці тымі ці іншымі пытаньнямі, а на страніцы самай апошняй, задрукаванай якімісь пытаньнямі, перапісчык у гары ліста піша сваёй рукой імя і хвамілію гаспадара і ўсе задрукаваныя пытаньні незапаўняе, а ўнізе страніцы паказывалі месца і казалі гаспадару расьпісацца.

Што посьле перапісчык на гэтай страніцы напіша, вось што цікава і важна. Там ён можа напісаць навет і вэксэль на 200.000 мк.

Гаспадар.

✦ З м. **Жалудка** Лідзкага павету паведамляюць, што ў Жалудзкай гміне ў часе перапісі, загаданай Галоўным Статыстычным Урадам Польшчы, перапісчыкамі былі пераважна польскія вучыцялі і вучыцелькі. Яны запісывалі беларусаў палякамі і расейцамі. Пыталіся: „Куды хочаш: чы да Польшчы чы да Расеі?“ — „Тут хачу астацца, у сваёй вёсцы“. — „А, як тут, то значыцца да Польшчы, бо тут Польшча,—падпішыся“. Застрашаны тым, што выганяць у Расею, селянін з болем у сэрцы падпісываўся. Хто адказываў: „Я рускай веры“ — таго запісывалі расейцам. Калі-б бесстароньнія людзі прыехалі і даведаліся, як рабілася тут перапісь, то яны праканаліся-б, што ўся зробленая статыстыка нічога супольнага з запраўднай статыстыкай ня мае і веры ёй даваць няможна. Яна толькі ярчэй паказала, з якога элемэнту складаецца тут польскае „вучыцельства“, запраўды зьняважаючае гонар польскага народа і польскага вучыцеля. Хай толькі гэтыя словы ня зробяць крыўды тым сьветлым людзём спаміж польскага вучыцельства на Беларусі, якія усё-ж аказываюцца, хоць і баяцца, як гэта ні дзіўна, выяўляць сябе.

✦ М. **Крынкі** Горадзенскай губэрні і павета. 20 лістапада 1921 г.—Грамада Беларускае Моладзі згуляла чародны сьпектакль. Ня гледзячы на дрэннае надвор'е, тэатр быў поўны, пастаноўка аплацілася. На сьпектаклі былі (на вольных месцах) дзеці з польскай школы і быўшыя беларускія вучні (беларуская школа, як ужо пісалася ў „Бел. Вед.“, тут зачынена), а таксама прыйшлі запрошаныя бэжанцы. Было паказана: „Каліcь“ Ф. Аляхновіча і „Конскі патрэт“ Л. Родзевіча. Асаблiва добра ў гэты вечар згулялі жаноцкія ролі сёстры М. і В. Крывашэйны і В. Касацкая.

Вехаць.

У Крынках польскія вучыцелькі надта цёмныя: уважаюць беларускую мову за „папсуты енэык польскі“. Бядуюць, што „народ польскі, а енэык такі брыдкі“, і што трудна ім вучыць тутэйшых дзяцей. Ато зьбяруцца ў нядзелю ў быўшай беларускай школе, адна скажа: „Каб чябе трасца взіала!“ і ўсе рагочуць. Трудна зразумець, дзе польскі школьны інспэктар знаходзіць такое духоўнае ўбожства на вучыцельскія пасады ў школах для беларускага насяленьня?

Падарожны.

✦ В. **Семяноўка** Крынскае гміны, Горадзенскае губ. і пав. У нашу беларускую вёску прыслалі польскую вучыцельку аж з-пад Варшавы. Божая кара над намі: за нехаджэньне ў гэтую школу многа прыходзіцца плаціць штрафаў.

✦ **М. Докшыцы**, Дунілавіцкага павету. 24|XI—1921 г. З гэтага школьнага году ў м. Докшыцах і ў воласьці школьная ўлада „адчыніла“ 8 польскіх і 1 беларускую пачатковую школу. Дагэтуль заняткі ні ў воднай школе не адбываюцца. Праўда, у беларускай школе заняткі былі пачаліся, але на загаду Лідзкага папячыцеля вучыцель школы часова звольнен з пасады, а другога тымчасам не прысылаюць.

У вёсцы Таргунах сяляне адмовіліся ад поль-

мелька, як макам сеяў, панікнуць і застыгнуць ад жудасьці дрэвы, паваляцца травы і здасцца яму распнуты Ісус Хрыстос. Вісіць Збавіцель на вялікім, высокім крыжу, раны яго точацца крывёю, а з маркотных вачэй капаюць сьлёзы...

Ня кожны й чараўнік ад вялікага страху жывы застаецца, бо перавазаць толькі, і то грэх і страх.

Толькі той, хто зусім аддаўся нячыстай сіле, і яна яму памагаець, толькі той вытрывае свой чараўніцкі хрэст і маець у жыцьці ўсяго, чаго яму заманецца. Адно што—ня дай Божа ані відзець, ані чуць, як трудзіцца гэткі грэшнік канаючы, пакуль ня рыгнець запраданаю душою.

Усе людзі на Белай Русі ведаюць гэты дыябальскі спосаб апанаваць раскошу нашага марнага сьвету.

Ведаў яго змалку і пан Якуб, ды і ў дум яму не трапляла, што некалі захочацца сам ужыць яго.

Праўда, не раскошнікам марнага сьвету хацеў ён зрабіцца. Але гэта яшчэ горш, бо задумаў ён тым спосабам упеўніцца: ці запраўды ёсьць над намі Божая воля.

Згубілі беднага філязофскія кнігі і праклятых лясьнік. Пад'юдзіў ён вучыцеля страляць у сьвятую кашку.

Прыйшоў вялікі пост. Вясна чулася ў паветры. Сьвешчаныя, але зрадаваныя людцы да споведзі хадзілі, паглядаючы, ці няма ўжо праталінак.

Пайшоў і настаўнік.

Відаць было па ім, што задумаў нешта нядобрае. Ды нікому нічога ані ў дум. Ці мала што бывае з чалавекам: хварэець, дрэнна выглядаець, гаворыць часам не да рэчы... Думалі, што нейкая туга запала на душу й настаўніку: можа хто з радні памёр, можа здакучыла век свой зжываць аднаму, можа навучаньнем у школе замардаваўся. Аж посьле даведаліся, што ён, гэта, сьвятую кашку на прычасьці ў кішэню схаваў!

Закрасавала вясна. Распусьціўся лес, зашумелі гоманам дубровы, ночы цёмныя прыйшлі, хлопчыкі пачлі коні на начлег вадзіць. Даўно скончыў свае заняткі ў школе наш пан Насовіч, толькі, замест папрaвіцца пасьля цяжкія працы скрозь усю зіму, ён высах на шчэпку і счарнеў, як зямля. Адны вочы, як вугальле, сьвецяцца...— „Зусім, як дурны“.—жалелі яго людзі і ня ведалі таго, што мучаецца чалавек ад паўсёднае думкі: зрабіць ці не зрабіць, распнуць ці верыць, як увесь сьвет верыць?

І паддаўся злому духу.

На самае на Купальле пайшоў у лес, пазычыўшы лясьнікову стрэльбу.

Посьле ён не таіўся, сам пераказываў, якога страху набраўся ў лесе, што аж розумам налажыў.

Ноч яму здалася векам.

Галава яго гарэла, як ў вагні. Сэрца то замірала, то стукалася на усю сілу. Сьцюдзёны пот аблій яго ня раз; а ён сядзеў у пушчы, у гушчарніку, і чакаў паўночы. Іногды сьвятлела ў галаве, і думаў: „Што я вытвараю? Начытаны, разумны, прыродазнавец—паверыў ў забабоны цёмнага люду і прыгожы абраз народнай казкі зрабіў сабе хваробаю і павадом для зьнявагі Вечнага Начатку!“ Зьнікала нядоўгае прасьвятленьне, і хваравітае думаньне пачыналася зноў.—„Ці ня ўсё роўна, які спосаб даведацца хоць крышку, адкуль усё і што яно?“—шаптала яму нячыстая сіла.—„Вера ў Бога—таксама прыгожы забабон, спрабуйжа пераджыць яго глыбей крышачку у сяньняшнюю ноч“...—фальшыва раіла жаданьне таёмнага. —„Якая зьнявага?—прыкідаўся запраданы Вэльзевулу розум:—ці-ж не на тое даў табе Вечны Начатак думкі, каб ты стараўся пазнаваць яго істоту? Калі рэжуць на кавалкі чалавека для навукі, ці-ж гэтым зьняважаюць у яго пастаці Божы вобраз харaства? Вось-жа ты і пачынаеш сяньня сваю практыку“...

І шмат чаго раілася у хворай галаве—бяз пляну, без парадку, бяз цьвёрдай сувязі.

Спадчына ранейшых пакаленьняў гаварыла яму, што зараз пабачыць ён у пушчы розныя нязвычнайныя купальскія дзівы,—хай-жа не баіцца! Што зараз пачнуць здавацца яму нявіданыя зьвярукі, баран з адрэзанаю галавою будзе бегчы на яго, будуць кугакаць совы, зацьвіціць заклятая краска папараці, пад нагамі засіпяць вужакі, павыпаўзаюць з нораў агідныя рапухі й яшчаркі.

Стаяў вучыцель пад асінаю й дрыжэў,—упацелы, бледны, зьнямоглы чакаў тых дзіваў.

Але, мабыць, з пашаны да яго духоўнай сілы—нічога не здавалася. Сонна шумела чорная дуброва, спалі зьвяры і птушкі, не варушылася мурашка па нявіднай упоцемку зямлі.

І пан Якуб падманіў сябе самога: „Ты й ня думаў верыць прыгожаму забабону... От, так сабе пайшоў адчуць харaство сонныя дубровы ў Купальскую ночку... Відзіш, як хораша, як прыгожа, як ціха! Прырода—ёсьць прырода, нявычарпаная крыніца для досьледаў навукі і багаты матар'ял для пясьнярскай творчасьці... Твая душа паэта здаволілась... Ідзі спаць... Цябе ўжо морыць сон“...

— Не, трэба мець сілы пераджыць усё крышачку глыбей... Ну, ну, пачынай ды йдзі сабе да хаты.

Падтаўхнуў чорт пад руку, прывязаў настаўнік хустачку з сьвятою кашкаю наасновы сучок.

Падтаўхнуў чорт адыйці ад дрэва трохі водаль.

Памог яму злажыцца стрэльбай.

Нацэліўся наш стралец у той бок, дзе павінен здацца Распнуты,—і як-бы чаго чакае.

І раптам зсекла вучыцеля думка: усё звычайна,—ні страху асаблівага, ні глыбокіх перажываньняў. Усё звычайна. „Па Сеньку шапка—зьняважыў мысьлена сам сябе.—Які з мяне шуканьне Бога. Што я за філёзаф? Дробненькі, маларазьвіты і ў прыдачу амбітны вучыцялёк.. Я і... Распнуты. Якая пошласьць духу з майго боку!“

Памысьліў, і стоптаны, абплёваны у сваіх ўласных вачох,—пацягнуў сабачку. Бо ўсё роўна той, хто нічога ня мае, нічога і ня траціць.

Раздаўся шумны стрэл, дзугнула стрэльба ў плячо і ў санкі няўмелага стральца.

Сьціхла...

Шуміць патроху сонная дуброва, цёмна, пах лесавыя сырасьці змагае сморад ад стрэлу.

Нічога не здалося, нічога няма, усё звычайна.

Вось з тае пары пан Якуб Насовіч і арашыўся здаровае чалавечае душы. Як страціў зорку, да якой так кіраваўся, то страціў і цікавасьць да змыслу й харaства. Зрабіўся сам сабе няцікавы, пусты.

Са школы яго прагналі, да нічога іншага стаўся ён цяпер няздатны; забрыў неяк у Горад... падурному дажываець там свой марны век.

Максім Гарэцкі.

25.VIII—1921 г.

26

Аб устрoi Сэрбскай аутахефальнай царквы у Угоршчыне. *)

Дзеля таго што ў № 10 „Беларускіх Ведамасьцей" было паказана, што найболей адпавядае сучасным вымаганьням устрой Сэрбска-Карлавіцкай царквы ў Угоршчыне, — будзе хіба цікаўным для чытальнікаў бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй і устроем гэтай царквы.

Сэрбы прынялі хрысьціянства ў XI веку ад грэкаў і неўзабаве заснавалі ў сябе Рошскую эпархію, падпарадкаваную Канстантынопальскаму патрыярху. У XIII веку сьв. Саўва быў увазьведзен у япіскапы і дастаў ад патрыярха права пасьвячаць япіскапаў. У 1346 годзе Стафан Душан згукаў Земскі Сабор, каторы праўзгласіў Душана царом і архіяпіскапа — патрыярхам. Але гэтая самастойнасьць царквы скончылася разам з незалежнасьцю царства пасьля перамогі туркаў над сэрбамі на Косавым полі ў 1389 годзе. Вялікія цярпеньні сэрбаў пад турэцкім панаваньнем і уціскаваньні з боку канстантынопальскага патрыярха падняла ўрэшце сэрбаў на высяленьне. У 1630 годзе сорак тысяч сэрбаў з патрыярхам Арсеніям І некалькімі япіскапамі па асобнай умове з аўстрыйскім імпэратарам Леапольдам І перасяліліся ў Угоршчыну і там аселі ў Карлавіцы і ваколіцах, пры чым манарх гварантаваў вольнасьць і самастойнасьць іх царквы.

На грунце актаў гасударстаей улады і звычаяў устанавіўся цэнтральны урад аўтакефальнай царквы з гэткіх складаных часьцін:

I. Карлавіцкі митрапаліт, якога ймянуюць у царкоўных граматах патрыярхам, выбіраецца Народна-Царкоўным Саборам і зацьвярджаецца манархам. У межах сваёй япіскопіі ён карыстае з усіх правоў эпархіяльнага архірэя і, апроч таго, яму належаць такія асобныя царкоўныя правы: 1) згуканьне Народна-Царкоўнага Сабора і Рады Сінода, Апэлятарскай Кансысторыі і Вучэбнай Рады і старшынстваньне ўва ўсіх гэтых установах, 2) абвяшчаваньне і споўненьне усіх пастанов ў Сабора і зносіны ад яго імя з усімі асобамі і ўстановамі, 3) назначэньне намесьніка ў сваю эпархію, архідыяканаў, віцэ-старшыні Апэлятарскай Кансысторыі, назначэньне і звальненьне канцэлярскага пэрсаналю ў цэнтральных царкоўных установах, 4) падаваньне кандыдатаў на япіскапаў, 5) нагляд за эпархіямі спосабам аб'ездаў 6) дазволы на прыняцьце манаскага сана і наданьне сану архімандрыта. 7) пачэсныя правы (асобная адзежа, тытул і інш.).

II. Сінод, які складаецца з усіх архірэяў, мае гэткі круг дзеяльнасьці: 1) разьвязаньне пытаньняў дагматычнага характару, азначэньне парадку богаслужэньня, нагляд за выкананьнем Закона Божага' адобрываньне твораў і да т. п., 2) разгляд праектаў статутаў, якія падаюцца Народна-Царкоўнаму Сабору, і укладаньне самастойных прапазыцый, 3) выбары, пастаўленьне і перамяшчэньне япіскапаў, выбары архімандрытаў і сяброў Апэлятарскай Кансысторыі, 4) укладаньне дысцыплінарных правілаў для духавенства і 5) разгляд царкоўна-судовых спраў ў апошняй інстанцыі.

III. Народна-Царкоўны Сабор склікаецца пераз кожныя тры гады. Надзвычайныя саборы склікаюцца па прапазыцыі Народна Царкоўнай Рады ці па вымаганьню 20 сяброў Сабора. У склад Сабора уваходзяць; а) усе эпархіальныя архірэі, б) 25 прадстаўнікоў ад кліра і 75—ад грамад, выбіраныя на тры гады. Дэпутаты ў гарадах выбіраюцца беспасрэдна ўсімі паўнапраўнымі грамадзянамі, а ў сельскіх грамадах — асобнымі выбарнымі якія выбраны ўсімі людзьмі грамады. Дэпутаты ад кліра выбіраюцца ўсімі сьвяшчэнна—і царкоўна-служыцелямі вокругу разам з выбіральнікамі мірскіх дэпутатаў. У круг дзеяльнасьць Сабора уваходзіць: 1) апека над захаваньнем і паддзержаньнем аўтакефальнасьці царквы, 2) укладаньне і зьмяненьне статуту, азначаючага ўстрой царквы, 3) Сабор выбірае свайго віцэ-старшыню і сэкрэтароў, кандыдата на катэдру патрыярха, сяброў Царкоўна-Народнай Рады, Апэлятарскай Кансысторыі і Вучэбнай Рады, а таксама галоўнага і эпархіальных інспэктароў па школы, 4) слухае і абгаварывае справаздачы аб стане царквы і ўсіх цэнтральных царкоўных установаў і 5) ўкладае і зацьвэрджае гадавы буджэт і мае агульны нагляд над усёю царкоўнаю маемасьцю.

(Канец будзе).

Т. Варонiч.

скай школы, і прыехаўшая польская вучыцелька „ня солена хлябаўшы" мусіла ехаць туды, скуль прыехала.

А ў вёсцы Слабадзе польская вучыцелька п. Т. усё мяркуець, як ляпей прывіць тутэйшым беларускім польскую культуру... і пакуль што занятакаў яшчэ не пачынала.

Такім чынам, як відаць, нашым сялянам ня прыдзецца вучыць у гэтым годзе сваіх дзетак грамаце. А вучыцца яны надта хочуць,—асабліва-ж на сваей роднай беларускай мове. Надта прыкра і вялікі сорам, што няма тут энэргічных беларускіх вучыцялёў.

Некаторыя-ж тутэйшыя-ж вучыцялі зрабіліся зраднікамі і сталі польскімі вучыцялямі, ці далі згоду ехаць ў Кракаў.

Івiнок.

◆ Сяляне в. Рабунь Рэчкаўскай вол. Вялейск. павета, жаляцца на польскага вучыцеля і селяніна в. Рабуні Гаўрылу Ількевіча ў справе няправільнага раздаваньня прадуктаў і бацінак Амэрыканскага Камітэта Помачы. Вучыцель, апроч таго, лае сялян самымі брудными маскоўскімі словамі. У справядлівасьці жалобы просяць пераканацца...

◆ Сяляне в. Гедзгалы Бяліцкай воласьці, Лідзкага павету, дзе пераважаючая большасьць праваслаўных жыхароў, не прынялі прысланага ім польскага вучыцеля, бо дамагаюцца беларускай школы. Тутэйшы войт, абпалячаны беларус-каталік, страшэнна заядлы вораг свайго-ж народу, пагражаў сялянам: „Век школы ня будзе, калі ня прымеце польскага вучыцеля". Да вайны тут была народная школа. Цяпер войт забраў парты і ўсе прылады і замкнуў у касьцёле (бышай царкве). Ня лепшы за войта і пісар, нейкі панок Балабанскі. А найгоршы, то гэта ксёндз паляк, які настраівае войта і называе ня йначай, як „хамамі", усіх беларусаў.—Лiдзкi.

◆ С. Загор'е-Сенінскае Любчанскай гміны, Наваградзкага павету. Уцекачы, якія вярнуліся год таму назад, ужо троху абжыліся, бо народ тутэйшы надта старанны і працавіты. Цяжка прыходзіцца тым, якія вярнуліся нядаўна і маюць толькі тое, што вымяняюць на апошнюю адзежынку,—з гэтага і жывуць. Газэты сюды на зразумелай для народа мове ня прыходзяць, а папольску рэдка хто разумее. Аб Беларусі за астатні час гутарак шмат. Купляюць-прадаюць тут найболей на „пуды" і даляры (значыцца, плоцяць пудамі збожжа). Конь каштуе 80—90 даляраў.

Тутэйшы.

◆ М. Любча Наваградзкага павета, Менскай губэрні. 2-га сьнежня (дзекабра) 1921 г. Сяляне прадаюць збожжа і жывёлу, каб посьле зайсьці ў тутэйшую „restauracju" (карчму) і купіць на барышы бутэльку гарэлкі за 1300 марак. Газэт ніякіх тут ня чытаюць, бо папольску ня ўмеюць, расейскія газэты ня прыходзяць; а беларускіх ня ведаюць, дзе дастаць, бо прызвычаіліся цягнуцца па ўсё ў Менск, а з Вільняй амаль зусім ня зьвязаны. Нацыянальная сьвядомасьць у сялян ёсьць. Аб Беларусі пытаюцца з нязвычайнай цікаўнасьцю і з запраўдным жалем. Сваім гмінным праўленьнем сяляне тутэйшыя, што бывае гэтак рэдка, здаволены: і войт, і пісар, і яго памоцнік — людзі даступныя, спагадлівыя, да беларускай мовы адносяцца з належнай пашанаю і ня пнуцца, як другія, выслужыцца перад начальствам.

Тутэйшы.

*) Друкуецца у сьвязку з пытаньнем аб аутакефаліі Беларускай Царквы.

Яўрэi i выбары.

Ніжэйназваныя яўрэйскія палітычныя і грамадзкія партыі і арганізацыі сілаў заяўляюць:

1) што яўрэі, як грамадзяне нашага краю, шчыльна з ім зьвязаныя і зацікаўленыя нароўне з іншымі грамадзянамі ў яго памысным разьвіцьці і красаваньні, лічуць сябе абавязанымі прыняць вучасьце ў Законадаўчым Сойме, скліканым на дэмакратычных пачатах і маючым за сваю мэту урэгуляваньне унутранага жыцьця края, распрацоўку адпаведных законадаўчых нормаў і ажыцьцёўленьне іншых правоў, прызвычаеных падобным органам народнага прадстаўніцтва,

2) што яўрэі лічылі б сваёю павіннасьцю прыймаць вучасьце ў плебісцыту, прадназначаным для разьвязкі пытаньня аб дзяржаўнай прыналежнасьці нашага края, калі-б былі створаны адпаведныя варункі, забясьпечваючыя правільнасьць яго правядзеньня

і 3) разьвязка пытаньня аб прыняцьці ўчасьця ў склікаемым цяпер Сойме можа наступіць толькі пасьля таго, як будзе выдан належны дэкрэт, азначаючы кампэтэнцыю і заданьні склікаемага Сойма.

Сыянісцкая партыя
Дэмакратычная партыя
Грамада яурэйскіх купцоу
Грамада яурэйскіх рамесьнікау
Партыя Цеірэ-Ціон.

Эканамiчны аддзел.

◆ Віленскі Саюз Каапэратываў атрымаў дужа значныя партыі папірос і табачных вырабаў і адзін вагон сярнічак „Блоня". Спадзяецца ў хуткім часе мець пшонную муку, селядцы і іншыя тавары.

◆ На Віленскі Саюз Каапэратываў, ня гледзячы на пратэсты, наложаны прамысловы падатак за 1920 год у суме 1 100.000 м. на прыбыль... якой і ня было. Урад Літвы Сьродковай, ў асобах некалькіх Дырэктароў, разглядаў пытаньне аб падатку на Віленскі Саюз і ў канцы канцоў усёж-такі вырашыў, што абложаньне правільнае.

◆ Дэпартамант Апровізацыі патрэбаваў ад Віленскага Саюзу Каапэратываў уплаты 2.000.000 м. пажычаных Саюзу яшчэ тады, як Дырэктарам Дэпартаманту Апровізацыі быў Вацлаў Івапоўскі. Ад другіх Саюзаў Каапэратываў „Centrali Stowarzyszeń Rolniczo Handlowych" і „Związku Ziemi Wileńskiej" зварот пажычкі ня трэбуецца. Саюз ужо заплаціў 500.000 а рэшта чуць дабіўся, каб адсрочылі.

◆ Дэпартамант апровізацыі, купіўшы жоўты цукер па 140 марок за фунт, сам прадаець каапэратывам (Шумскаму) па 240 мар. фунт, робячы налічэньне на кожны фунт цукру каля ста марак. (№ 277 „Gaz. Krajowej").

◆ 6 сьнежня у Маладзечыне былі вось якія цэны: жыта 1500 м. пуд, авёс 1300, ячмень 1400 м., гарох белы 1600 м., шэры 1200., боб 1700 м., грэчка 1300, альняное семя 1700 м., лён чысты 8-10 000, воўна 1000 м. фунт, бульба 400 м., сьвініна 220 м., кумпякі 240 м., жывыя сьвіньні 7000-8000 м., масла кароўскае 1000 м., яйкі 350-400 м. дзесятак.

◆ 16 лістапада у Маладзечыне былі гэткія цэны на прадукты: жыта 1500, гарох белы 1500, шэры 1400, боб 1600, яйкі 35-40, сала 400, мяса валовае 180-200, масла 1000 м.

◆ 28 лістапада у Браслаўскім павету былі цэны: жыта 1100-1200, пшаніца 1600, ячмень 900, авёс 900, гарох белы 1000, шэры 800-900, насеньне альняное 1300-1400, бульба 275-300, цыбуля 300, буракі 300, грыжына 250, капуста 200, яйкі 20-25, сыры 150-175, саланіна 275-300, лой 200-250, мяса валовае 110, бараніна 90-100, масла 700-800.

◆ 22 лістапада у Багданаве (Валожынскі павет) былі цэны: жыта 1600, пшаніца 1900, ячмень 1600, семя альняное 1600-1700, мак 7000, лён 6000-8000, бульба 350, цыбуля 900, морква 400, буракі 350-400, грыжына 350-400, яйкі 30, сыры 180, саланіна 400-425, сьвініна 200, масла 900, сьвіньні 9000, кмін фунт 650.

◆ 28 лістапада ў Паставах (Дунілавіцкі пав.) адзначаны цэны: жыта 1200, ячмень 1100-1200, авёс 1100-1200, гарох шэры 1000 1100, насеньне альняное 1350, бульба 250, капуста 225, яйкі 20-25, саланіна 400-500, сала нутраное 400, сьвініна 150-200, мяса валовае 130-140, масла кароўскае 800-900.

Пiсьмо у Рэдакцыю.

I.

ПАВАЖАНЫ РЭДАКТАР!

Апроч некалькіх кароценькіх брашурак, да гэтага часу ў беларускай мове па сельскай гаспадарцы нічога недрукавалася. Што ў гэтым віна:— адсутнасьць яшчэ патрэбы ў папулярнай сельска-гаспадарскай літэратуры, недахват адмыслоўцаў ў аграноміі, якія взяліся-б за гэту вельмі карысную працу, альбо нястача грошы на выданьне—мне, ня маючаму зьвязі з цэнтрамі беларускага руху, аб гэтым нічога невядома.

Як чалавек, маючы сьпецыяльную адукацыю і колькі-гадовую практыку па сельскай гаспадарца—з аднаго боку, і з другога—як беларус, пільна дбаючы аб лепшай долі свайго народу, я зварачываюся к Вам, Паважаны Рэдактар, з гэтым пісьмом, у якім маюся выкласьці свой пагляд на вышэйзакранёную справу перад беларусамі аграномамі і грамадзянствам і, калі ён будзе варт увагі, прысьці мне на помач.

Я цьвёрда пераконаны ў тым, што даўно прышоў час азяцца за стварэньне папулярнай-літэратуры па сельскай-гаспадарцы ў беларускай мове. Пашырэньне беларускіх пачатковых школ на вёсцы вымагае даць у школьныя бібліятэкі папулярных кніжак аб вясковай гаспадарцы, бо кожны вучань гэтай школы—сын земляроба, і яго першы абавязак скончыўшы школу будзе азяцца за плуг. Як лепей гаспадарыць на вузкай палосцы, дапаможа яму кароценькая даступна напісаная кніжка. Хто ведае, што маючы на ўвазе сягоньня толькі пачатковыя школы агульнай асьветы, мы заўтра ве пачнем гукаць аб школах земляробства, садоўніцтва і інш. А да гэтага трэба быць прыгатаваным. Перш-наперш трэба будзе мець падручнікі. Апроч вымаганьня школы, такая кніжка спатрэбіцца і вясковаму вучыцелю для чытаньня сялянам у сьвята і для працы на школьным гародзе ў буднія дні і так сама здаволіла-б, патрэбы кожнага пісьменнага земляроба.

Усё гэта разам складжанае, прымусіла мяне азяцца за працу і я, ня ведаючы які лёс трапіць маю кніжку пішу падручнік па садоўніцтву. Але сельская гаспадарка складаецца не з аднаго толькі садоўніцтва, а мае яшчэ шмат іншых галін, ня меней важных, і кожная з іх вымагае для сябе адпаведнага знаёмства. Аднаму няўправіцца. Дзеля гэтага клікаў-ба ўсіх, хто чым толька можа з практыкі ці тэорыі павялічаць сельска-гаспадарскую кніжную веду азяцца чым-скарэй за працу! А каб праца наша была-б болі прадуктыўнай і болі карыснай, памойму як-нібудзь трэба стварыць паміж сабою зьвязь. Трэба ведаць, колькі нас ёсьць раскіданых па „калідорах" і „сяродках" і падрахаваць свае сілы. А падрахаваўшы сілы, мы-б, калі так можна сказаць, разабралі-б ролі кожан па сваёй здольнасьці. Можа-б нам пашанцавала стварыць цэлае таварыства пашырэньня сельска-гаспадарскай веды на Беларусі, ці хоць выбраць рэдакцыйную калегію, якая-б кіравала-б працай і укладала-б тэрміналёгію.

Сягоньня няведаючы напэўна, як спаткае мой гэты праект беларускае грамадзянства, а асабліва адмыслоўцы па сельскай гаспадарцы, я асьцярагаюся многа расходзіцца і папрашу зацікаўленых гэтай справай, на старонках «Беларускіх Ведамасьцей» выкласьці свае паглёды на мае думкі і калі спадабаюцца, ці ня возмець хто на сябе абавязак Арганізатара. Другія беларускія газэты прашу перадрукаваць

10 XI 1921 г. Я. Пачопка.

Poczta Łużki pow. Dzisieńskiego wieś Letniki

II.

Паважаны Рэдактар, не адмоўце зьмясьціць у Вашай газэце гэты ліст:

12 сьнежня г.г. каля 11 гадзіны, я цікаўлючыся зьездам, саргапізаваным п. Аляксюком, зайшоў у памяшканьне Рабочага Дому (вул. Жэлігоўскага № 4). Ля уваходных дзьвярэй Дому напаў я на агідны абразок біцьця агентамі Аляксюка аднаго з сяброў Нацыянальнага Камітэта п. Пракулевіча. Як грамадзянін, я заступіўся і быў, праўда, ня біты, але выкінуты за браму на вуліцу. Не ўваходзячы ў крытыку закуліснай працы п. Аляксюка і К-о, я, як прадстаўнік друку, пратэстую супроць дзікасьці змаганьня з палітычнымі праціўнікамі, а тым болей з прадстаўнікамі друку. Вышэй памянёны спосаб змаганьня ясна трактуе аб заданьнях і мэтах работы Аляксюкоўскае камарыльлі.

Ул. Міхалевіч.

Пратэст.

Беларускія артысты м. Вільні гэтым пратэстуюць супроць выступленьня на Аляксюкоўскім зьезьдзе, нейкага п. Вайткевіча, які выступаў ад імя беларускіх артыстаў, ня маючы на гэта права і ўпоўнаважаньня.

По даручэньню артыстаў

рэжысэр Шчасны.

Вучнеускi вечар.

У нядзелю 11-га сьнежня у салі І Віл. Бел. Гімназіі адбылася вечарына на карысьць беларускага прытулку.

Пастаўлена была п'еска. „Хлопчык у лесе" А. Гаруна. Гэты вечар даў беларускай публіцы, якой было паўнюсенькая саля, агляд артыстычных здольнасьцяў вучняў малодшых клясаў гімназіі і прытулковых дзяцей. П'есу згулялі дужа добра. Відаць што тут кіравала рука, уложыўшая шмат працы. Пасьля п'есы адбыліся дэклямацыі прытулковых дзяцей, якія чытанымі вершамі ўзварушывалі душы прысутных. Нарэшце пад гукі „Лявоніхі" выходзіць 4 пары маладых тянцораў, якія сваімі споўненьнямі „Лявоніхі" і „Юркі" выклікалі поўны фурор. Тады выступіў вучнёўскі хор пад кіраўніцтвам вучыцеля пяяньня. Згірскага Белар. песьні, асабліва марш хор выпаўніў дужа добра, толькі застаецца незразумелым, чаму сьпялі усяго 2 куплеты „Адвеку мы спалі:" (мусіць замарыліся). Рыбка-лотэрэя відаць дала добры даход.

Рыбалоў.

Паштовя скрынка.

Рэдакцыям усіх беларускіх газэт.

Для карысьці нашай справы за граніцай, просім пасылаць па 5 экз. Вашае газэты па адрасу: Łotwa, Riga, Nikolai ella № 20, p. Kastucienku.

Кастусёнку.—Рыга.

Усе карэспадэнцыі і 100 марак дасталі. Дзякуем. 50 марак перадалі „Беларускаму Звону". 5 даляраў ад гр. Бубешкі аддалі на Т-ва Белар. Школы. На ўсе Вашы адрасы газэту пасылаем. Прышлеце пэўны адрэс гр. Бубешкі, ці гр. Гайдука. Будзем дужа рады, калі зможаце пісаць нам кожны тыдзень.

К. Шышко.—Мір.

Заяву Таварыству Беларускае школы перадалі. Яно дасьць Вам адказ на ўсе пытаньні. За паддзержку (500 мар.,) дзякуем, газэту высылаем. Пішэце нам часьцей будзем дужа рады.

К. Шашко.—Докшыцы.

Вашае пытаньне аб тым, як дастаць фэльчару па старой кніжцы належную пэнсію, перадалі ў Нацыянальны Камітэт, які і дасьць Вам патрэбны адказ.

Грам. Козану.—Эстонія.

Вашае пісьмо перадалі ў Нацыянальны Камітэт. Радзім Вам у справе новай Вашай прафэсіі зьвярнуцца беспасрэдня ў Музыкальна-Драматычны Гурток (Вільня, Біскупская, 12). Што датыча каморна-таксатарскай працы, дык яе можна знайсьці вясною, бо цяпер на камэральныя работы разьлічаць трудна. Зарабляюць каморнікі ў Віленшчыне надта добра.

Курс на грошы у Вiльнi.

12 сьнежня 1921 г.

Царскія 100 р	675
Нямецкія маркі (1000)	1790
Осты (1000)	1700
Даляры	3225
10 руб. золатам	14925

Рэдактар і Выдавец: Максім Гарэцкі. Друкарня „ДРУК". Субач 2.